# ПАХВАЛА ВЯЛІКАМУ КНЯЗЮ ВІТАЎТУ

**Сінкевіч Ірына Леанідаўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Суйкаўская базавая школа Віцебскага раёна”

***Кіраўніка можна параўнаць з лодкай, а народ — з вадой: вада можа несці лодку, а можа яе перакуліць***

*Урок праводзіцца ў 9 класе. Гэта другі ўрок у раздзеле падручніка “Чалавек і грамадства. Постаці айчыннай гісторыі ў беларускай літаратуры”. На занятку вучні пазнаёмяцца з асноўнымі фактамі беларускага летапісання і прычынамі яго ўзнікнення, асноўнымі сюжэтнымі лініямі твораў “Летапіс вялікіх князёў літоўскіх”, “Беларуска-літоўскі летапіс (1446)” — “Пахвала Вітаўту”, з асноўнымі кірункамі дзяржаўнай палітыкі славутага князя Вітаўта.*

**Тэма:** Беларускі летапіс. (“Летапіс вялікіх князёў літоўскіх”, “Беларуска-літоўскі летапіс (1446)” — урывак “Пахвала Вітаўту”).

**Мэта:** да заканчэння ўрока вучні набудуць веды пра асаблівасці летапісу як жанру старажытнай літаратуры, у якім адлюстроўваюцца гістарычныя падзеі; пазнаёмяцца з відамі летапісных твораў; асэнсуюць жанравыя асаблівасці і мэту стварэння “Пахвалы Вітаўту”.

**Задачы:**

– даказаць, што “Пахвала Вітаўту” — новы крок беларускай літаратуры ў набыцці рысаў прозы;

– развіваць уменні суадносіць звесткі з гісторыі са зместам твора;

– выхоўваць цікавасць да гісторыі сваёй Радзімы, пачуццё нацыянальнай годнасці.

**Тып урока:** урок засваення новых ведаў.

**Эпіграф:**

*Мінулае трэба ведаць не таму,*
*што яно прайшло,*
*а таму, што, адыходзячы,*
*яно не ўмела схаваць сваіх вынікаў.*
*В. Ключэўскі*

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант.**

Стварэнне псіхалагічнага настрою і матывацыі да актыўнай пазнавальнай дзейнасці на ўроку.

**II. Мэтавызначэнне.**

Паведамленне тэмы ўрока, фармулёўка мэты ўрока.

**III. Вывучэнне новай тэмы.**

Загадзя падрыхтаваны вучань чытае верш Максіма Багдановіча “Летапісец”.

Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах,
Свой век канчаю я ў манастырскіх мурах
І пільна летапіс другі ўжо год пішу:
Старанна літары малыя вываджу
І спісваю ўсё ад слова і да слова
З даўнейшых граматак пра долю Магілёва.
І добрыя яго, і кепскія дзяла
Апавядаю тут. Так рупная пчала
Умее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак,
І бачанаму мной — я годны веры сведак.
Хай тыя ведаюць, што з’явяцца па нас,
Ўсю праўду пра жыццё ў наш і пройшлы час,
Пра войтаў, лаўнікаў, і райцаў і паспольства,
Пра розных каралёў, і бітвы, і пасольства,
Што тут чынілася ў даўнія гады,
Што думалі, чаго жадалі мы тады,
За што змагаліся, як баранілі веру, —
— Хай зведаюць усе патомкі праз паперу!
Яно забудзецца, умрэ, з вадой сплыве, —
І вось у спомінах устане, ажыве,
Калі знайдуць маё няхітрае пісанне
Пра гэтае жыццё, надзеі, справаванне…
Так мора — у Гданску я чуваў, — прымчыць вадой
Бутэльку к берагу, аблітую смалой,
Усю ў дробных ракаўках і ў ціне. Не замала
Яна была ў вадзе і шмат чаго спаткала.
Рыбалкі вылавяць бутэльку, разаб’юць
І, як трапляецца, быць можа ў ёй знайдуць


Беларускі летапіс
«Летапіс вялікіх князёў літоўскіх»,
«Пахвала Вітаўту»)
СВЯТО РОДНАГА СЛО




СВЯТО РОДНАГА СЛОВА

Ліста. За звычаю марского гэтак весьці
Нам, патапаючы, шлюць людзі. Ў моры дзесьці
Загінулі яны, і, можа, сотні год
З тых часаў працяклі, і згінуў іх народ,
І ўсё змянілася, і ўжо пра іх забылі.
Вы, літары, цяпер нанова ўсё збудзілі!
І людзі зведаюць аб прадзедах сваіх,
Аб горы, радасцях і аб прыгодах іх,
Каму маліліся, чаго яны шукалі,
Дзе на глыбокім дне іх крыюць мора хвалі.

*Настаўнік.*

Верш, які вы праслухалі, называецца "Летапісец". Летапісец — гэта складальнік летапісаў, а летапіс — гісторыка-літаратурны твор з апісаннем падзей па гадах. Стварэнне летапісу — вельмі цяжкая, карпатлівая праца, якая патрабавала вялікай адукацыі, вытрымкі, маральнай і фізічнай сілы, бо адна кніга магла перапісвацца некалькі гадоў. (Настаўнік паказвае фотаздымак келлі, у якой звычайна працаваў летапісец) Летапісанне ўзнікла яшчэ ў эпоху феадальнай раздробленасці. Гістарычныя запісы вяліся амаль ва ўсіх значных гарадах: Полацку, Слуцку, Навагрудку… Аўтарамі летапісаў былі свецкія і духоўныя асобы (адукаваныя людзі свайго часу), прадстаўнікі розных сацыяльна-культурных колаў тагачаснага грамадства. Летапісцы адлюстроўвалі гістарычныя падзеі паводле сваіх поглядаў, таму летапісы адрозніваюцца сваім зместам, ідэйнай накіраванасцю, жанравымі асаблівасцямі, спосабамі ўзнаўлення матэрыялу. Росквіт летапісання прыпадае на XV–XVI стагоддзі. Самым раннім помнікам беларуска-літоўскага летапісання з'яўляецца "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх". Яго напісаў ананімны аўтар яшчэ ў першай палове XV стагоддзя. У "Летапісцу вялікіх князёў літоўскіх" уваходзіць уласна "Летапісец" і "Аповесць пра Падолле". У сваю чаргу "Летапісец" складаецца з дзвюх частак, 1-я з якіх — невялікая гістарычная аповесць. У цэнтры ўвагі аўтара — барацьба за ўладу, якая пачалася ў ВКЛ пасля смерці Альгерда Гедымінавіча паміж яго братам Кейстутам і сынам Ягайлам. Кейстут даведваецца пра намер пляменніка захапіць уладу і бярэ яго ў палон, але затым велікадушна адпускае. Праз нейкі час барацьба разгараецца з новай сілай. Кейстут і яго сын Вітаўт выступаюць супраць Ягайлы. Набліжаецца бітва. У рашаючы момант Ягайла прапаноўвае мірна вырашыць усе пытанні і запрашае да сябе ў Вільню для перамоў свайго дзядзьку і стрыечнага брата. Князі прынялі прапанову, але іх падманулі. Кейстут і яго сын былі схоплены і апынуліся ў Крэўскім замку, дзе Кейстут па загадзе Ягайлы быў задушаны, а Вітаўт, пераапрануўшыся ў жаночае адзенне, збег у Прусію.

Дома вы пазнаёміліся з "Пахвалой вялікаму князю Вітаўту". Наша задача на ўроку — даць адказы на наступныя пытанні:

– У чым роля князя Вітаўта ў гісторыі, на думку аўтара "Пахвалы…"?
– Якім чалавекам паўстае перад намі князь са старонак твора?
– Чаму аўтар абраў для апісання князя менавіта жанр пахвалы?
– Якія асаблівасці гэтага жанру?

На дошцы вывешваецца табліца "Асноўныя падзеі ў жыцці Вітаўта"

Адказ на 1-е пытанне дасць вучань-гісторык… (Вучань рыхтаваўся загадзя паводле кнігі А. Краўцэвіча "Вялікі князь Вітаўт")

*Вучань-гісторык.*

Вітаўт (1350–1430) — яркая асоба, слынны сын сваёй Айчыны, вялікі князь ВКЛ, сын Кейстута, унук Гедыміна. Сваё імя князь атрымаў у гонар язычніцкага Бога Святавіта, якога шанавалі славяне (у перакладзе: жаданы ці гаспадар). Дзяцінства і юнацтва правёў на землях Балтыі. Потым жыў на тэрыторыі Беларусі. Актыўную палітычную дзейнасць пачаў у 1382 годзе пасля забойства Ягайлам яго бацькі. У 1392 годзе ў Вільні Вітаўт каранаваўся і атрымаў правы незалежнага князя пад апекай караля.

Менавіта ў часы праўлення Вітаўта (1392–1430) ВКЛ становіцца буйнейшай дзяржавай, якая завязвае дыпламатычныя адносіны амаль з усімі заходнееўрапейскімі краінамі, Турцыяй, Крымскім ханствам і Масковіяй.

*Настаўнік.*

— Якая галоўная заслуга Вітаўта як дзяржаўнага дзеяча?

(Аўтар "Пахвалы" ўслаўляе князя як мудрага і ўсемагутнага гаспадара, даносіць да чытача сваё ўяўленне пра яго веліч, гаворыць пра агромністы палітычны ўплыў Вітаўта ў Еўропе, пра яго вялікі міжнародны аўтарытэт. Вітаўт робіць паходы на Віцебск, Смаленск, Украіну, пазбаўляе ўлады непакорлівых мясцовых князёў. Далучае да Вялікага Княства Літоўскага беларускія і украінскія землі, умацоўвае іх палітычнае адзінства)

*Настаўнік.*

Твор напісаны з нагоды каранацыі князя і паказвае значэнне і ролю ВКЛ. У ім услаўляецца палітыка Вітаўта, яго дзяржаўная дзейнасць і ўсемагутнасць. Аўтар "Пахвалы…" сцвярджаў, што вялікі князь узводзіў на прастол і пазбаўляў улады татарскіх ханаў Залатой Арды і фактычна валодаў "усёй рускай зямлёй". На яго каранацыю прыехалі высокія госці з многіх куткоў свету: вялікі князь маскоўскі, князь мазавецкі, перакопскі хан, валахскі гаспадар, паслы візантыйскага імператара, мітрапаліт Фоцій, магістр лівонскі…

Асноўныя падзеі ў жыцці Вітаўта

| Дата | Падзея |
|---|---|
| 1350 | У князя Кейстута нарадзіўся сын Вітаўт |
| 1363, 1370, 1372 | 1-я ваенныя паходы Вітаўта на чале з бацькам і дзядзькам (вялікім князем Альгердам) |
| 1377 | 1-ы самастойны паход супраць Тэўтонскага ордэна |
| 1377 | Смерць вялікага князя Альгерда |
| 1380 | Патаемная змова Ягайлы з крыжакамі |
| 1381 | Кейстут заняў Вільню і арыштаваў Ягайлу |
| 1382 | Захват у палон Вітаўта і Кейстута Ягайлам. Кейстут задушаны ў Крэўскім замку, а Вітаўт уцякае ў Прусію |
| 1384 | Вяртанне Вітаўта ў Літву |
| 14 жніўня 1385 | Была падпісана Крэўская унія (пагадненне аб дынастычным саюзе паміж Польскім каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім) |
| 1390 | Адыход Вітаўта ў Прусію. Адзіная дачка Вітаўта Соф'я заключае шлюб з вялікім князем маскоўскім Васілём Дзмітрыевічам |
| 1392 | Вітаўт становіцца вялікім князем |
| 1395 | Далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Смаленскага княства |
| 23 красавіка 1398 | Салінскі мір паміж ВКЛ і Тэўтонскім ордэнам |
| 1409–1411 | Вялікая вайна з Тэўтонскім ордэнам |
| 15 ліпеня 1410 | Грунвальдская бітва |
| 1413 | Гарадзельскі прывілей |
| 1422 | Вітаўт прымае прапанову чэхаў стаць іх каралём |
| 27 кастрычніка1430 | Падрыхтоўка да каранацыі, смерць вялікага князя |

Гэты факт сведчыць пра міжнародны аўтарытэт Вітаўта і дзяржавы, якой ён кіраваў.

— Чаму аўтар называе Вітаўта Аляксандрам? (Гэтае імя ён атрымаў, калі прыняў праваслаўную веру)

— Вызначце ідэю "Пахвалы…" (Ва ўрыўку гучыць ідэя агульнадзяржаўнага адзінства, патрыятызму, ідэя абароны і ўмацавання ВКЛ. Аўтар услаўляе дыпламатычныя здольнасці князя, яго справядлівасць і мудрасць. Вітаўт уладарыў 37 гадоў, і з кожным годам дзяржава, якой ён уладарыў, станавілася больш моцнай)

**IV. Падвядзенне вынікаў урока.**

Вучням прапануецца калектыўна скласці сінквейн на тэму "Вітаўт".

Вітаўт

Справядлівы, мудры.

Княжыў, кіраваў, умацоўваў.

Князь карыстаўся вялікім міжнародным аўтарэтэтам.

Уладар.

**V. Рэфлексія.**

Працягніце выказванні:

» Я думаю, што значнасць дзейнасці Вітаўта для беларускай зямлі ў тым ____________
__________________________________________

» Я лічу, што "Пахвала вялікаму князю Вітаўту" не столькі гімн Вітаўту, але ___________
__________________________________________

» Вывучэнне летапісаў мне дало _________
__________________________________________

**VI. Дамашняе заданне**

Пазнаёміцца з біяграфіяй Францыска Скарыны (стар. 23–28).

Вывучыць на памяць урывак з прадмовы да кнігі "Юдзіф".